**Ірына Поўх**
Брэст (Беларусь)

# Архетыпы дому і чужога ў зборніку Алеся Разанава *Гановерскія пункціры*

Тэрмін «архетып», шырока распаўсюджаны дзякуючы працам швейцарскага псіхолага К. Г. Юнга, як праява калектыўнага падсвядомага або «аб'ектыўнай душы» – адна з літаратурных з'яў, што выклікаюць найбольшую цікавасць навукоўцаў. Даследчыкі адрозніваюць універсальныя і этнічныя архетыпы. Сярод пашыраных універсальных архетыпаў – утаймаванага агню, хаосу, тварэння, шлюбнага саюзу, мужчынскага і жаночага пачаткаў, змены пакаленняў, «залатога веку», Сусветнага Дрэва і інш. Этнічныя архетыпы (этнакультурныя архетыпы) адлюстроўваюць і адначасова ў пэўным сэнсе вызначаюць адметныя рысы ментальнасці, характару, гістарычнага лёсу таго ці іншага народа. Паводле К. Г. Юнга, этнічныя архетыпы выяўляюць не толькі народны вопыт мінулых часоў, але і запаветныя мары народа, яго ўяўленні пра сваю будучыню.

Дом – адзін з асноватворных архетыпаў беларускай культуры. Ён сімвалізуе цэнтр свету, прыстанішча Вялікай Маці, а таксама замкнёнасць і абарону. Дом з'яўляецца таксама адлюстраваннем усяго Сусвету і традыцыйна звязваецца з ідэяй свяшчэннай прасторы, якая разгортваецца вакол ачага як «восі свету» і асвячаецца сценамі гэтага дома. Архетып дому разглядаецца і як сканцэнтраванне асноўных жыццёвых каштоўнасцей – шчасця, дастатку, адзінства сям'і і ўсяго роду. У беларускіх культурных феноменах, артэфактах нярэдка сустракаецца гэты сімвал. Напрыклад, у прыказках і прымаўках нярэдка згадваецца пра дом, яго функцыі і значэнне ў жыцці індывіда і грамадства («Дадому (дахаты) і конь спрытней бяжыць», «Дома і салома ядома, на чужыне і гарачы тук стыне», «Дома хоць няўежна, дык улежна», «Дарагая тая хатка, дзе мяне радзіла матка», «Нідзе так, як дома», «Усюды добра, а дома лепей»). Дом у беларусаў нярэдка называецца памяншальна-ласкальна «хатка», «хата». Недарэмна нашы

продкі з даўніх часоў стараліся асвяціць свой дом. Таму часта сустракаюцца выказванні «мой, наш дом», які супрацьпастаўляецца «чужому», «не нашаму» дому. Многім народам уласціва ўспрыняцце свайго жытла ў адпаведнасці з вядомым выслоўем «мой дом – мая крэпасць», дзе кожны чалавек знаходзіцца ў бяспецы, надзейна абаронены «роднымі сценамі» ад усякіх напасцяў, непрыемных сітуацый.

Архетып дому як увасабленне прыналежнасці да пэўнай суполкі (нацыянальнай, сацыяльнай, грамадскай і г.д.) неадрыўна звязаны з архетыпам чужога – сімвалам непадобнасці да іншых, адасаблення паміж «сваімі» і «чужымі». Але калі першы з адзначаных архетыпаў падкрэслівае агульныя ўласцівасці, што паядноўваюць прадстаўнікоў адной групы, то другі акцэнтуе адметнасці, што вылучаюць адзначаную суполку з шэрагу аднаўзроўневых. Архетып чужога выступае ў літаратуры адным са сродкаў адлюстравання нацыянальнай самасвядомасці, элементам бінарнай апазіцыі «сваё – чужое». На значнасць гэтага архетыпу для ўсведамлення сябе ў адрозненне ад іншых звяртаюць увагу шматлікія даследчыкі (у прыватнасці Ю. М. Лотман, М. М. Бахцін, Н. І. Асмонава і інш.).

Архетып дому і антанамічны яму архетып чужога як сродак адлюстравання нацыянальнай самасвядомасці, уяўлення ўласных адметнасцей і адметнасцей сваёй нацыі ў сусветнай палітычнай і культурнай прасторы ўваходзяць у шэраг найбольш распаўсюджаных у эмігранцкай паэзіі. Іх актуальнасць абумоўліваецца аддаленасцю аўтара ад радзімы, парушэннем сувязяў з сям'ёй, блізкімі, сябрамі, знаходжаннем у незнаёмым, чужым і патэнцыяльна варожым асяроддзі. У такой сітуацыі асабліва абвострана ўспрымаецца ўсё, што тым ці іншым чынам нагадвае пра дом, сям'ю і радзіму – ці сваім падабенствам (увасабляючыся, такім чынам, праз архетып дому) ці адрозненнем, нязвыкласцю (архетып чужога).

Зборнік *Гановерскія пункціры* (2002) Алеся Разанава выдадзены падчас шматгадовага знаходжання паэта ў «творчай стажыроўцы» за мяжой (Германія – Аўстрыя) на дзвюх мовах – беларускай і нямецкай. Сам аўтар вызначае яго месца і ролю ў сваёй творчасці так:

> *Гановерскія пункціры* маюць сваю сьпецыфіку і ад айчынных пункціраў адрозьніваюцца тым, што ўзьніклі ў асяродку, які мне давялося асвойваць і засвойваць, і ім абумоўліваюцца. У іх нешта ёсьць і ад

нататкі, і ад замалёўкі. Гановер у іх прысутнічае відавочна, а ў прысутным мне важна было заўважыць сутнае[1].

*Гановерскія пункціры*, як і іншыя творы Алеся Разанава, вылучаюцца назіральнасцю, увагай да дробных дэталяў і іх патаемнага сэнсу, таго «сутнага», што адзначае аўтар у прыведзенай вышэй гутарцы. Так, сімвалам чалавека, які адчувае сябе чужым у незнаёмым горадзе, недарэчным, няздольным знайсці ў ім сваё месца, выступаюць дрэвы, што, быццам старыя вяскоўцы, завіталі ў горад і відавочна не да ладу там, парушаюць гарадскі ландшафт і прымушаюць іншых адчуваць няёмкасць за іх.

У куксінах:
і калі
вы ўжо навучыцеся, як трэба
расьці, гарадзкія дрэвы?![2].

Звяртаючыся да дрэваў, паэт быццам звяртаецца да самога сябе, пытаючыся, ці знойдзе калі-небудзь сябе на чужыне, ці зможа асіміляваца да чужой культуры і ладу жыцця.

Адчуванне ўласнай недасканаласці як адна з праяў архетыпу чужога прысутнічае ў шэрагу *Гановерскіх пункціраў*. У пункціры ****Блукаю сцямнелымі вуліцамі…* „недасканаласць" чалавека супрацьпастаўляецца „дасканаласці" манекенаў у вітрыне крамы:

Блукаю сцямнелымі вуліцамі.
З вітрын
глядзяць узорныя людзі[3].

Разгубленасць і адзіноту чалавека ў чужой яму культуры перадае і эпітэт «сцямнелыя»: адсутнасць святла як арыенціру ў незнаёмых абставінах прымушае чалавека рухацца навобмацак, рабіць памылкі і выпраўляць іх, падаць, зноў уставаць і ісці далей.

Матыў блукання, страты мэты, арыенціраў і самаідэнтычнасці – аснова пункціра ****Блукаю па вуліцах…* У гэтым творы, як і ў згаданым вышэй, у якасці арыенціру выступае крыніца святла – сонца, якое змяняе сваё месцазнаходжанне, з'яўляючыся «то з левай рукі, то з правай»[4], у залежнасці ад таго, у які бок ідзе чалавек, і таму не можа

---

1 А. Івашчанка, А. Разанаў, *Паэзія: «уводзіны ў невымоўнае». Гутарка Анатоля Івашчанкі з Алесем Разанавым*, „Дзеяслоў" 2005, № 19.

2 А. Разанаў, *Гановерскія пункціры Hannoversche punktierungen*, Гановер 2002, 95, [1] с. 32.

3 А. Разанаў, *Гановерскія …*, с. 86.

4 Там же, с. 6.

служыць надзейнай апорай. Страта самаідэнтычнасці перадаецца праз азначэнне «незнаёмец» – чужы і незразумелы не толькі тым, хто навокал, але і самому сабе.

Матыў несвоечасовасці, непадабенства і непрыняцця гучыць у шэрагу пункціраў Алеся Разанава. У адным з іх, яго ўвасабленнем з'яўляецца месяц, што днём паказаўся з-за хмар і зноў схаваўся (пункцір ****Употай зірнуў на мяне…*). У пункціры ****І што за пачвара?!…* чужынцам становіцца верталёт, вакол якога кружаць птушкі. Агрэсія апошніх перадаецца на фанетычным узроўні, праз алітэрацыйны паўтор гука [р] і спалучэння гукаў [вр], якія не толькі выступаюць сродкам гукапісу, прымушаючы чытача «пачуць» карканне варон, але і паяднноўваюць ключавыя словы твора, падкрэсліваючы яго асноўную ідэю.

«І што за пач*вар*а?!» –
к*р*ычаць
узбу*р*аныя *вар*оны:
знікае
за *д*р*эв*амі *вер*талёт[5]. (курсіў наш – І. П.).

Працэс «нараджэння» новай асобы, прысутнасці ў новай прасторы і пераходу ў новую «сутнасць» адлюстроўваецца Алесем Разанавым праз вобраз ліста, што «нараджаецца» з пупышкі.

Лопаецца на каштане
пупышка:
ого як няпроста
вылузвацца з абалонак!..
Ведаю, ліст[6].

Абалонкі – вонкавыя ўмоўнасці і стэрэатыпы, навязаныя чалавеку знешнім асяроддзем, – прарастаюць унутр, успрымаюцца як яго неад'емная частка. Паступова чалавек страчвае сваё „я", становіцца чужым самому сабе, і ачышчэнне, вяртанне да сапраўдных каштоўнасцей патрабуе цяжкай працы, намаганняў і пераадолення.

Адным з лейтвобразаў *Гановерскіх пункціраў* і адной з асноўных праяў архетыпу чужынца ў ім выступае вобраз восеньскай лістоты. Менавіта яе вырывае і раскідвае вецер, быццам лёс эмігрантаў, які адрывае людзей ад іх каранёў, ад звыклага асяроддзя, сям'і і сваякоў, культуры (пункцір ****У жменю набраў…*). Лісце прыпадабняецца паэ-

[5] А. Разанаў, *Гановерскія …*, с. 42.
[6] Там же.

там да бежанцаў, якія запаланілі вуліцы, шукаючы прытулку ў чужой краіне (пункцір ****Вуліцы з бежанцамі…*).

Неад'емнай часткай архетыпу чужынца выступае матыў дарогі. Ён гучыць у аддаленым грукаце колаў цягніка (пункцір ****Прачнуўся ўначы…*), увасабляецца ў вобразе ветра, які пытае дарогу ў чарацінаў (пункцір ****Ці ў гэты бок дзьму?…*). Туга па радзіме адлюстроўваецца ў аблоках, якія плывуць на ўсход, у бок Беларусі:

У тым акне –
злева направа,
у гэтым – справа налева:
мкнуцца
гурмой аблокі –
і ўсе на ўсход[7].

Архетып дому ўвасабляецца паэтам праз сістэму вобразаў, тыповых для беларускай культуры. Тут і тыповая сялянская хатка з чыста падмеценым ходнікам (пункцір ****Упаў залацісты ліст…*), і бабуля, якая „ўзіраецца праз акуляры ў імглу адвячорка"[8] (пункцір ****Імглою вачэй…*), і матуля, што павучае дзіцёнка (пункцір ****Вось так…*).

Цікавай і незвычайнай праявай архетыпу дому становіцца вобраз куста ў пункціры ****Да чырвані ягадаў…* Каларыстыка твора – чырвоныя ягады, зялёнае лісце, белы снег – паўтарае колеравую гаму беларускага дзяржаўнага сцяга.

Да чырвані ягадаў
і зеляніны лісця дадаў
таксама і снег свой колер:
усё ты маеш цяпер,
куст на Шарлотэнштрасэ[9].

Выснова двух апошніх радкоў твора падкрэслівае значнасць радзімы ў жыцці чалавека: калі яна ёсць – ён мае ўсё, калі ж яе няма, усё адно нечага не будзе хапаць. Чалавек, які пакінуў радзіму і не можа туды вярнуцца, пачувае сябе быццам сабака, якога пакінула прывязаным гаспадыня, і ён не можа за ёю пабегчы (пункцір ****Брэша сабака…*).

---

7 А. Разанаў, *Гановерскія …*, с. 14.
8 А. Разанаў, *Гановерскія …*, с. 84.
9 Там же, с. 12.

Сімвалам радзімы, думкі і клопат пра якую паяднoўваюць людзей, раскіданых лёсам па ўсім свеце, выступае вобраз старой камяніцы (пункцір ****Адна адной падавалі…*).

Адна адной падавалі
прысягі, што будуць
трымацца дарэшты разам?!
Цагліны
старой камяніцы[10].

Камяніца – адзін з найбольш распаўсюджаных тыпаў жылых і культавых збудаванняў Заходняй Беларусі XVI–XIX стст.[11] У пункціры гэты вобраз становіцца сімвалам трываласці, вынослівасці, загартаванасці беларусаў, іх задзіночання супраць нягод. Здзіўленне староннягa назіральніка гэтай незвычайнай унутранай сілай, здольнай пераадолець усе перашкоды, перадае сінтаксічная структура твора, першая частка якога мае форму клічна-пытальнага сказа.

Дыяпазон увасабленняў архетыпаў дому і чужога ў зборніку *Гановерскія пункціры* Алеся Разанава вельмы шырокі. Ён ахоплівае сістэму вобразаў, гукапіс і каларыстыку твора, яго сінтаксічную арганізацыю. Думкі і пачуцці чалавека, які адчувае сябе чужынцам у незнаёмай яму краіне перадаюцца праз адухаўленне рэчаў, раслін, з'яў прыроды. Дыялагічнасць шэрагу твораў, пабудаваных у форме пытальных ці клічна-пытальных сказаў, запрашае чытача далучыцца да аўтарскіх разважанняў, уважліва паглядзець навокал, пачуць тыя пытанні, што задае кожны пражыты дзень, паспрабаваць адшукаць адказы на іх і зрабіць свае высновы, якія, магчыма, стануць першым крокам да адкрыцця ўласнай «сутнасці».

[10] Там же, с. 26.
[11] Ю. Гардзееў, *Гародня: паміж мінулым і будучым*, „Туризм и отдых" 2007, 7 сакавіка.

**Summary**

## Home and stranger archetypes in Ales Razanau's book *Hannoversche punktierungen*

This article deals with the archetypes of home and stranger in the poetry collection of Ales Razanau "Hannoversche punktierungen" (2002). The introductory part describes the importance of the above archetypes for Belarusian culture. The author considers the manifestations of archetypes of home and stranger at the levels of imagery, phonetics, colour range and syntax. The main motifs discovered are those of loss, going astray and nowhere. The home archetype is rendered mainly through the images of people and buildings. Other stylistic peculiarities pointed out are the dialogue between the author and the reader, colouristics and its function in rendering the main idea as well as personification of things, flora and natural phenomena.